# НАШ ГОЛАС



Выпуск № 1

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў.*

*Паважаныя сябры! Вы чытаеце першы нумар школьнай газеты. Мэта нашай газеты – асвятляць школьнае жыццё. Мы раскажам аб школьных падзеях, святах, паездках, конкурсах. Мы адкрыты для ўсіх.. Можаце прыносіць нам свае цікавыя матэрыялы, мы абавязкова іх надрукуем. Такім чынам, далучайцеся, пішыце артыкулы, задавайце пытанні і станавіцеся нашымі карэспандэнтамі.*



**Чытайце ў гэтым нумары:**


- **Акцыя “Місія – жыць!”**
- **Сустрэчы з цікавымі людзьмі**
- **14 кастрычніка – Дзень Маці!**
- **Працоўны дэсант (школьны суботнік)**
- **Актыўны адпачынак на канікулах**
- **Школа спартыўная**
- **Працоўная акцыя**

## Акцыя “Місія – жыць!”

У нашым раёне з 20 па 25 кастрычніка 2014г. праходзіла акцыя “Місія – жыць!”. У рамках гэтай акцыі ў нашай школе быў праведзены флэш-моб, вучні школы ўдзельнічалі ў конкурсе слоганаў і антынаркатычнай рэкламы, былі выпушчаны газеты “Мы - за здаровы лад жыцця!”. У класах праведзены класныя і інфармацыйныя гадзіны на адпаведную тэматыку.



24 кастрычніка на вуліцах вёскі Мінойты праходзіў адзіны дзень інтэрактыва. На пляцоўцы каля вясковага магазіна прадстаўнік Маладзёжнага парламента, вучаніца 10 класа Грушэўская Валерыя, якая распаўсюджвала лістоўкі і праводзіла апытванне.





# СУСТРЭЧЫ З ЦІКАВЫМІ ЛЮДЗЬМІ

## Сустрэча з урачом-валеолагам

30 верасня 2014 года адбылася цікавая сустрэча з урачом-валеолагам дзяржаўнай установы "Лідскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі". Паўлава Марыя Адольфаўна правяла дзве цікавыя лекцыі для вучняў школы. Першая была для вучняў пачатковых класаў, а другая - для вучняў 5-8 класаў.





Гэта была не проста лекцыя, гэта быў дыялог. Вучні актыўна ўдзельнічалі ў гутарцы, адказвалі на пытанні, якія задавала Марыя Адольфаўна. Дзеці атрымалі шмат карыснай і цікавай інфармацыі. А завяршэннем кожнай з лекцый стаў прагляд відэаролікаў і мультфільмаў.

*************************

## Сустрэча з педагогам-псіхолагам

17 кастрычніка 2014 года нашу школу наведала педагог-псіхолаг дзяржаўнай установы "Лідскі занальны цэнтр гігіены і





эпідэміялогіі" Блашко Юлія Вандалінаўна. Яна правяла гутарку з вучнямі 3 і 4 класаў, а таксама з матулямі гэтых вучняў. Гутарка была вельмі цікавай. Пад час гутаркі і матулі, і вучні атрымалі цікавыя і каштоўныя парады.

# Дзень маці

14 кастрычніка – гэта адзін з самых прыемных і светлых свят – Дзень маці. Гэта свята, якое аб’ядноўвае вакол светлага вобразу жанчыны-маці дарослых і дзяцей, мужчын і жанчын, працаўнікоў сяла і працоўных, акадэмікаў і міністраў.

Так, у 3 і 4 класах было арганізава святочнае мерапрыемства, прысвечанае Дню маці. Настаўнікі і вучні старанна рыхтаваліся, каб павіншаваць матуль. Трэба адзначыць, што у іх гэта вельмі добра атрымалася.



********************************

## *Дзень маці ў доме-інтэрнаце для псіханеўралагічных хворых*

14 кастрычніка вучні школы завіталі ў мясцовы дом-інтэрнат, каб павіншаваць са святам, Днём маці. Яны прадставілі сваю літаратурна-музычную праграму. У школе здаўна існуе традыцыя віншаваць хворых





дома-інтэрната з рознымі святамі. Вучні рыхтуюць канцэртныя праграмы і выступаюць у гэтай установе, старанна робяць сваімі рукамі віншавальныя падарункі.

# АКТЫЎНЫ АДПАЧЫНАК

## Канікулы – цікава і з карысцю!





Канікулы – добры час для падарожжаў. Вось і вучні 5,6 і 7 класаў падчас восеньскіх канікул наведаліся ў раённы цэнтр, дзе іх гасцінна сустрэў музей ваенных маракоў, створаны на базе СШ №10 г. Ліды, і Цэнтр народных рамёстваў і промыслаў.

Экскурсію па музеі правёў сапраўдны марак-падводнік. Ён вельмі цікава расказваў пра жыццё маракоў, пра службу на падводнай лодцы, паказваў экспанаты музея: часткі сапраўдных падлодак, фотаздымкі, вадалазны касцюм і прылады для выхаду ў адкрытае мора. Пакой музея выкананы ў выглядзе падлодкі: там ёсць і ілюмінатары, і ланцугі, і тросы. Падзякаваўшы за цікавы аповед кіраўніку музея, школьнікі накіраваліся ў Цэнтр народных рамёстваў. Экскурсавод правяла для дзяцей пазнавальную экскурсію, расказала і паказала этапы апрацоўкі лёну нашымі продкамі, штодзённы побыт беларускіх сямей раней. Школьнікам быў прадэманстраваны майстар-клас па валянню поўсці, у якім некаторыя вучні прымалі непасрэдны ўдзел.

Адным словам, дзецям спадабалася такая вандроўка, дзе яны цікава і з карысцю правялі час.

*Гаўрылюк Анастасія і Наваргран Таццяна, вучаніцы 6 класа*

**************************************************

## Эксурсія ў Мінск



Апошні дзень канікул запомніцца мне і маім аднакласнікам надоўга. Мы вырашылі яго правесці разам, а дакладней, паехаць на экскурсію ў г. Мінск.

Мы ўжо не першы раз у Мінску. Да гэтага наведвалі музей Я. Купалы, дэльфінарый, Нацыянальную бібліятэку, цырк, была абзорная экскурсія па горадзе.Усё гэта, безумоўна, выклікала незабыўныя ўражанні. На гэтых канікулах мы пачалі сваю экскурсію з наведвання Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы – старэйшага прафесійнага тэатра Беларусі, які па праву завецца "першай сцэнай рэспублікі". Мяркую, што шмат хто, і я таксама, ідзе менавіта ў гэты тэатр з мэтай падмацавацца духам нашай мовы, каб спатоліць прагу да трапнага беларускага слова. Прагляд спектакля "Паўлінка" быў ужо даўно нашай марай.

Дзве гадзіны прадстаўлення праляцелі як адна хвіліна. Звычайная гісторыя пра тое, як дзяўчына абрала сабе жаніха насуперак бацькоўскай волі. Народны паэт Беларусі Янка Купала шчодра аздобіў яе нацыянальным каларытам і сакавітым народным гумарам. Разам з цымбаламі, глінянымі слоікамі і вырабамі з саломкі тут убачыш стылізаваную сялянскую хату, распісны куфар, ручнікі і паясы. Даведаешся, як скакаць "Лявоніху", наслухаешся народных песень і трапіш на вясковую вечарынку.

Канец спектакля. Авацыі, кветкі і эмацыйны водгук з боку гледачоў, што з'яўляецца яўнай заслугай тэатра і годнай узнагародай за ягоны шматгадовы ўклад ў культурнае жыццё краіны. Атрымалі асалоду ад выдатнай ігры акцёраў. Уражанні ад наведвання тэатра і пабачанага спектакля застануцца самымі добрымі, душэўнымі , раднаснымі і незабыўнымі.



Наступны этап маршруту - аквапарк "Лябяжы". Ён з'яўляецца першым паркам водных забаў у сталіцы, а таксама адным з найбуйнейшых у краінах СНД і пятым па велічыні ў Еўропе.

Дух захоплівае ад водных забаў і купання ў басейне. Колькі мы там атрымалі захаплення і радасці, немагчыма апісаць словамі!

Стомленыя, але радасныя вярталіся дамоў. Па дарозе мы дзяліліся сваімі ўражаннямі ад паездкі. Прыйшлі да высновы, што ў сталіцы нашай краіны ёсць яшчэ шмат культурных цэнтраў, якія хацелася б наведаць - гэта і музей Вялікай Айчыннай вайны, і Батанічны сад, і Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета. Карацей, ёсць прычыны, каб наведаць гэты цудоўны горад яшчэ не адзін раз.

*Шчалканогава Марыя, вучаніца 8 класа*

# ШКОЛА СПАРТЫЎНАЯ



Вучні нашай школы вельмі любяць спорт. Яны з задавальненнем займаюцца на занятках фізічнай культуры, але акрамя гэтага яны наведваюць яшчэ і спартыўныя секцыі. А вынікам гэтага з'яўляецца добрае здароўе і станоўчыя вынікі на спартыўных спаборніцтвах. Так за першую чвэрць 2014/2015 навучальнага года вучні нашай школы, пабыўшы на раённых спаборніцтвах, занялі прызавыя месцы і прывезлі шмат узнагарод (Кавалёнак А., Лісоўская А., Гаўрылюк А., Стэцэвіч І., Мусатава Н., Енза Д., Драгун А., Енка Г., Рудзевіч В.)





# ДАПАМАЖЫ ПРЫРОДЗЕ

У школе на працягу года праводзіцца акцыя па збору макулатуры. Усе вучні старанна збіраюць макулатуру. Па выніках 1 чвэрці 2014/2015 навучальнага года (у разліку на 1 вучня):



I месца – 11 клас (50 кг/ч);
II месца – 7 клас (33,7 кг/ч);
III месца – 3 клас (30 кг/ч).




У канцы першай чвэрці пачалася акцыя "Здай батарэйку – захавай прыроду", якая праводзіцца кожны год. Найбольшую актыўнасць па збору батарэек паказваюць вучні 2, 3 і 4 класаў.

## Гумарэска са школьнага жыцця



Учительница рассказывала на уроке о великих изобретателях. Потом спросила учеников:
– А что бы вы хотели изобрести?
Один ученик сказал:
– Я бы изобрёл такую машину: нажмёшь кнопочку – и все уроки готовы!
– Ну и лентяй! – засмеялась учительница.
Тут Вовочка поднял руку и сказал:
– А я бы придумал такое устройство, которое нажимало бы эту кнопочку!


| | | | |
|---|---|---|---|
| **НАШ ГОЛАС**<br>*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ<br>**Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:**<br>Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:**<br>в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |